www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

9 лістапада 2007 года, № 17 (1968)

ПАДЗЕІ

# НАВУКА – ПАДМУРАК РОСКВІТУ КРАІНЫ

***122 дэлегаты Беларускага дзяржаўнага універсітэта на чале з рэктарам прафесарам Васілём Стражавым бралі ўдзел у Першым з'ездзе вучоных Рэспублікі Беларусь, які прайшоў у Мінску 1–2 лістапада.***

У склад дэлегацыі ўвайшлі кіраўнікі вучэбных падраздзяленняў і навукова-даследчых устаноў, вядучыя вучоныя і спецыялісты універсітэта. Яны ўдзельнічалі ў абмеркаванні актуальных для сучаснай беларускай навукі тэм, распрацоўцы рашэнняў і дакументаў.

1 лістапада дэлегаты размеркаваліся па дзевяці навуковых секцыях: па аграрных, біялагічных, медыцынскіх, фізіка-тэхнічных навуках, ваенна-тэхнічных праблемах, гуманітарных навуках і мастацтву, фізіка-матэматычных навуках і інфарматыцы, хіміі і навуках пра Зямлю і "Моладзь і інавацыі". На базе БДУ працавала секцыя па біялагічных навуках. У яе рамках была арганізавана выстава навукова-тэхнічнай прадукцыі, дзе дэманстраваліся апошнія распрацоўкі ў галіне біялогіі навукоўцаў з НАН, БДУ і яшчэ 12-ці ВНУ краіны. Адбылася мультымедыйная прэзентацыя біялагічнага факультэта БДУ. Акрамя таго, 30 найменняў навукова-тэхнічнай прадукцыі нашага універсітэта было прадстаўлена на выставе "Навука і інавацыі Беларусі" ў Нацыянальным выставачным цэнтры. 2 лістапада ў Палацы Рэспублікі прайшло пленарнае пасяджэнне навуковай эліты краіны, прадстаўнікоў дзяржаўных устаноў і арганізацый, шматлікіх замежных госцей – усяго амаль 2 тыс. чалавек.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў звярнуўся Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка. У сваім выступленні ён адзначыў, што ў Беларусі створаны аптымальныя ўмовы для ўкаранення навуковых адкрыццяў. За апошнія 6 гадоў унутраныя выдаткі на даследаванні і распрацоўкі ўзраслі ў 8 разоў і зараз перавышаюць 500 млрд бел. руб. Сёння ў рэспубліцы навуковымі даследаваннямі займаецца больш за 300 арганізацый, дзе працуюць больш чым 18 тыс. чалавек, аднак пакуль унёсак навукоўцаў у народную гаспадарку краіны нельга назваць дастатковым. "Нам патрэбны канкрэтныя прапановы па мадэрнізацыі эканомікі, па буйных сістэмных праектах, якія б маглі аказаць значны эфект", – падкрэсліў ён. Па словах кіраўніка краіны, сёння неабходна максімальна інтэграваць навуку і вытворчасць, аб'ядноўваць сілы розных ведамстваў і калектываў для рашэння комплексных задач, а не распыляць сродкі па асобных дробных структурах і тэмах. Таксама ён звярнуў увагу на неабходнасць паралельнага развіцця як фундаментальнай, так і прыкладной навукі з улікам рэальных магчымасцяў дзяржавы. Сярод найважнейшых задач, якія стаяць перад беларускай навукай, ён назваў павышэнне долі айчынных распрацовак у буйнейшых праектах, што ажыццяўляюцца ў Беларусі; больш актыўны ўдзел навукі ў імпартазамяшчэнні высокатэхналагічнага абсталявання, медыцынскіх прэпаратаў, праграмнага прадукту; забеспячэнне харчовай і энергетычнай бяспекі, у тым ліку за кошт больш глыбокай пераапрацоўкі вуглевадароднай сыравіны; актыўнага выкарыстання альтэрнатыўных крыніц энергіі і прыродных рэсурсаў, садзейнічанне зніжэнню кошту жыллёвага будаўніцтва; падрыхтоўку высокакваліфікаваных маладых навуковых кадраў; больш інтэнсіўнае ўкараненне навуковых распрацовак у вытворчасць.

Акрамя таго, Прэзідэнт дзяржавы заявіў, што беларуская навука павінна садзейнічаць захаванню і памнажэнню культурных і духоўных традыцый народа. "Гісторыя, філасофія, педагогіка і іншыя навукі павінны быць прывязаны да сённяшняга грамадства. Яны не могуць ізалявацца, замыкацца ў вузкіх карпаратыўных рамках, а мусяць актыўна садзейнічаць усталяванню непарыўнай сувязі кожнага беларускага грамадзяніна са сваёй радзімай". Далей Аляксандр Лукашэнка адзначыў: "Універсітэцкая кафедра – не месца для прапаганды антыдзяржаўных поглядаў і ідэй. Кожны выкладчык абавязаны выхоўваць у студэнтаў павагу да сваёй дзяржавы. Асабісты прыклад педагога павінен быць асновай выхавання ў вышэйшай школе. Задача выкладчыкаў – не толькі "запіхнуць" энную колькасць інфармацыі ў галовы студэнтаў, але і вырасціць з іх грамадзян сваёй краіны. Кожны навуковец павінен быць не толькі высакакласным спецыялістам, але і ўзорам для пераймання, сапраўдным патрыётам Радзімы". Пры гэтым кіраўнік дзяржавы прыгадаў старажытную мудрасць: "Хто паспявае ў навуках, але адстае ў маральнасці – больш адстае, чым паспявае". Прэзідэнт упэўнены, што ў Беларусі ёсць усё неабходнае, у тым ліку кваліфікаваныя навуковыя кадры, для таго, каб вывесці краіну на самыя перадавыя рубяжы. Асаблівую ўвагу ён звярнуў на прыцягненне маладзі да навукі. "Падтрымка маладых кадраў – гэта інвестыцыі ў будучыню", – падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. У Беларусі, адзначыў ён, створана сістэма стымулявання таленавітых юнакоў. Істотна павысіліся стыпендыі аспірантаў, лепшым з іх прызначаны спецыяльныя прэзідэнцкія стыпендыі. Да 100 прэзідэнцкіх надбавак штогод налічваюцца найбольш здольным маладым навукоўцам. Уведзены надбаўкі за вучоныя званні.



На з'ездзе: беларускія вучоныя абмяркоўваюць пытанні развіцця навукі

Усё гэта істотна паляпшае матэрыяльную забяспечанасць людзей навукі, павышае іх аўтарытэт у грамадстве і, адпаведна, прывабнасць навуковай сферы для моладзі, – упэўнены беларускі лідар. Навуцы належыць вядучая роля ў інавацыйным развіцці эканомікі Беларусі, рэалізацыі эфектыўных інвестыцыйных праектаў, тэхналагічным пераўзбраенні і рэструктурызацыі вытворчасці, павышэнні нацыянальнай бяспекі краіны.



На экспазіцыі БДУ (зправа налева): рэктар Васіль Стражаў, начальнік Галоўнага ўпраўлення новукі Таццяна Дзік, прарэктар па навуцы Уладзімір Панькоў і намеснік начальніка ГУН Мікалай Касцюк

Міністр адукацыі Беларусі Аляксандр Радзькоў паведаміў, што ў рэальны сектар эканомікі Беларусі ўкараняецца больш за 800 навуковых распрацовак, штогод беларускія навукоўцы атрымліваюць больш чым 300 патэнтаў на вынаходніцтва. Нягледзячы на гэта, інтэграцыя навукі, адукацыі і вытворчасці адбываецца недастаткова эфектыўна. "Прычынай незапатрабаванасці многіх вынікаў навукова-даследчай дзейнасці з'яўляецца не нізкая якасць айчынных распрацовак, а неадпаведнасць іх тэхнічных характарыстык і параметраў патрабаванням рэальных вытворчасцяў", – патлумачыў Аляксандр Радзькоў. Для рашэння гэтай праблемы міністр прапанаваў праводзіць агульныя семінары і біржы з удзелам работнікаў вытворчасці і прадстаўнікоў навуковых устаноў. Іх сумесныя дыскусіі паскораць працэс укаранення інавацый на вытворчасцях, дапамогуць задаволіць канкрэтныя патрэбы прадпрыемстваў у новых тэхналогіях і абсталяванні.

Аляксандр Радзькоў вызначыў шэраг актуальных праблем у сістэме адукацыі Беларусі. Так, напрыклад, якасць адукацыі на розных узроўнях адукацыйнай сістэмы не аднолькавая, многія навучэнцы, якія паспяхова закончылі школы, не пацвярджаюць свае веды ва універсітэтах. Таксама ў рэспубліцы назіраецца тэндэнцыя да скарачэння колькасці маладых спецыялістаў у навуковай сферы. За апошнія гады колькасць доктарскіх дысертацый скарацілася ў 3,5 разы. "Нам трэба распрацаваць канкрэтныя захады па заахвочванні маладых навукоўцаў. Вырашэнню гэтай праблемы паспрыяе і нядаўні ўказ аб павышэнні памераў даплат за вучоныя ступені", – сказаў міністр. Ён упэўнены, што высокая якасць адукацыі і навукі немагчыма без укаранення сучаснага абсталявання. За апошнія гады ў Беларусі створана 14 цэнтраў для калектыўнага карыстання унікальнай тэхнікай, аднак гэтага недастаткова, і аб'ём фінансавання з дзяржбюджэту на набыццё перадавога абсталявання будзе павялічвацца.

Яшчэ на з'ездзе выступілі старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясніковіч, старшыня ДКНТ Уладзімір Мацюшкоў, нобелеўскі лаўрэат Жорэс Алфёраў і іншыя выбітныя навукоўцы, грамадскія дзеячы і прадстаўнікі ўлады.

По заканчэнні была прынятая рэзалюцыя. Паводле яе, у прыватнасці, гарантуецца штогадовае вылучэнне для базавага фінансавання навуковых устаноў і ВНУ не менш за 10 % сродкаў, якія прадугледжаны ў рэспубліканскім бюджэце на навуковую, навукова-тэхнічную і інавацыйную дзейнасць. Акрамя таго, гаворыцца пра фарміраванне вучэбна-навукова-вытворчых аб'яднанняў на базе ВНУ, арганізацый НАН, галіновых навукова-даследчых інстытутаў.

З'езд вучоных – знакавая падзея не толькі для нашай краіны, але і для ўсёй постсавецкай прасторы, бо такія форумы нідзе дагэтуль не праводзіліся, што сведчыць аб вялікай увазе да гэтай сферы з боку кіраўніцтва Беларусі.

**Падрыхтаваў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

**Фота БелТА і Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

**У НОВЫ БУДЫНАК У НОВАЙ ЯКАСЦІ**

**Аб рэарганізацыі факультэта журналістыкі распавядае дэкан Сяргей ДУБОВІК**

**Стар. 2**

**СТУДЭНТЫ ГОДА–2007**

**Знаёмімся з лаўрэатамі штогадовага конкурсу БДУ**

**Стар. 3**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

20-е ПАСЯДЖЭННЕ Савета па супрацоўніцтве ў сферы адукацыі краін–удзельніц СНД прайшло 25 кастрычніка ў Ерэване пад старшынствам рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава, які ачольвае гэты орган Садружнасці. На ім адбыліся выбары кіраўніка на наступныя тры гады. У выніку Васіль Стражаў быў пераабраны на гэту пасаду.

ПАГАДНЕННЕ аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Таўрычаскім нацыянальным універсітэтам імя Вярнадскага падпісана ў Сімферопалі кіраўнікамі абедзвюх ВНУ – Васілём Стражавым і Мікалаем Багровым. Напрыканцы лістапада ўкраінская дэлегацыя наведае БДУ для абмеркавання канкрэтных сумесных дзеянняў па рэалізацыі гэтай дамовы.

ДЭЛЕГАЦЫЯ БДУ на чале з прарэктарам Віктарам Самахвалам 17–19 кастрычніка нанесла візіт у Кітай, дзе прыняла ўдзел ва ўрачыстым адкрыцці ў новым будынку сумеснай Кітайска-беларускай аспірантуры, а таксама Хэйлуцзяньскага цэнтра навуковых даследаванняў на базе Харбінскага універсітэта навукі і тэхналогій.

РЭКТАР нашага шматгадовага партнёра – Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта Віктар Садоўнічы падчас свайго знаходжання ў Мінску для ўдзелу ў І З'ездзе вучоных Беларусі падараваў БДУ камплект вучэбнай літаратуры, якая неўзабаве будзе дэманстравацца ў Фундаментальнай бібліятэцы.

НАМЕСНІК СТАРШЫНІ Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы, дакладчык Камісіі па палітычных пытаннях Андрэа Рыгоні ў рамках свайго візіту ў Беларусь 17 кастрычніка наведаў БДУ, дзе сустрэўся з рэктарам прафесарам Васілём Стражавым. Таксама спадар Рыгоні выступіў перад студэнтамі і адказаў на іхнія пытанні.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УСТАНОВЫ

***З 1 студзеня 2008 года факультэт журналістыкі рэарганізуецца ў інстытут. Каментуе гэтую падзею дэкан журфака Сяргей Дубовік:***



# У НОВЫ БУДЫНАК У НОВАЙ ЯКАСЦІ

– Пытанне аб рэфармаванні факультэта ўздымалася даўно. Перад намі стаяць сур'ёзныя задачы. Папершае, гэта паляпшэнне якасці падрыхтоўкі журналістаў з прымяненнем найноўшых тэхналогій. Па-другое – стварэнне сістэмы перападрыхтоўкі кадраў у сферы мас-медыя, якой сёння яшчэ няма. Падчас рэгулярных сустрэч з кіраўнікамі рэгіянальных СМІ і адміністрацыяй абласцей шмат гаворыцца пра кадравую праблему розных катэгорый. Толькі палова супрацоўнікаў рэгіянальных СМІ мае вышэйшую журналісцкую адукацыю, а другая частка прыйшла ў газеты, на радыё, тэлеканалы з іншых сфер – гэта настаўнікі, інжынеры і г. д. Як бачым, сітуацыю трэба паляпшаць. На нядаўнім пасяджэнні ў адміністрацыі Прэзідэнта была прапанаваная новая сістэма якаснай перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў і падрыхтоўкі журналістаў на базе вышэйшай адукацыі. Гэтую ідэю падтрымаў і міністр адукацыі. Для яе рэалізацыі факультэт журналістыкі падыходзіць як мага лепей. У нас сабраны лепшыя кадры ў дадзенай галіне, і мы валодаем выдатнай базай. У выніку 30 кастрычніка на пасяджэнні Вучонага савета БДУ было прынята рашэнне аб адпаведным пераўтварэнні нашага падраздзялення ў інстытут. Ён будзе складацца з двух факультэтаў: акадэмічнай (дзённая і завочная формы) падрыхтоўкі – гэта тое, што мы сёння маем, і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў і павышэння кваліфікацыі. У аснову навучання лягуць традыцыйныя 2-тыднёвыя курсы, а таксама месячныя курсы і групы па скарочанай праграме падрыхтоўкі журналістаў на базе вышэйшай адукацыі (дзённая і завочная формы) на 2 гады. Навучанне – платнае. Мяркуем, што фінансаванне возьмуць на сябе абласныя выканаўчыя камітэты, якія будуць адбіраць кандыдатаў. Без сумневу, жадаючых будзе шмат, паколькі існуе вялікая запатрабаванасць у кваліфікаваных спецыялістах. Дзякуючы грунтоўнай перападрыхтоўцы значна палепшыцца якасць матэрыялаў у друкаванай прэсе і СМІ ўвогуле.

**– Ці адкрывае гэта дадатковыя магчымасці для атрымання журналісцкай адукацыі студэнтам нашага універсітэта і іншых ВНУ?**

– На сустрэчах з міністрам адукацыі Аляксандрам Радзьковым і першым намеснікам Старшыні Адміністрацыі Прэзідэнта Анатолем Рубінавым было выказана пажаданне апрабаваць у якасці эксперымента 2-гадовае навучанне студэнтаў па спецыяльнасці "Журналістыка", якія закончылі тры курсы на іншым факультэце ВНУ. Чаму б і не, калі адчуваеш, што тваё пакліканне – журналістыка? У такім выпадку мы атрымаем профільных спецыялістаў – прафесіяналаў у сваёй справе. Дарэчы, пэўная форма навучання існуе ў некаторых еўрапейскіх дзяржавах. З цягам часу мы арганізуем гэта і ў нас, але найперш трэба вырашыць праблемы з перападрыхтоўкай дыпламаваных спецыялістаў.

**– Якую ролю ў рэфармаванні факультэта выконвае пераезд у новы корпус, што па вул. Кальварыйскай?**

– Дзяржава надае шмат увагі падрыхтоўцы журналістаў і ствараe для гэтага ўсе ўмовы. Да прыкладу, толькі наша новая тэлестудыя каштуе каля 3 млн долараў. Атрымліваем дастатковыя плошчы, абсталяванне... Пераход на новы ўзровень, безумоўна, будзе садзейнічаць павышэнню якасці навучання і на асноўным факультэце. Тут галоўная задача – максімальна звязаць вучобу з практыкай пры дапамозе сучасных тэхнічных сродкаў. Мы пастаянна ўдасканальваемся. Так, з 1 верасня 2008 года на спецыяльнасці "Журналістыка" ў дадатак да напрамкаў "Друкаваныя СМІ" і "Радыё і тэлебачанне" адкрываецца новы – "Вэб-журналістыка" для падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы мас-медыя інтэрнэта. Сёння гэта вельмі актуальна. Плануем дамагчыся 15-ці бюджэтных месцаў на наступны год. Будзем імкнуцца і надалей адпавядаць новаму статусу.

**Гутарыў Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

ВІНШУЕМ!

## З ЦЯГАЙ ДА НАВУКІ

***Каля 200 чалавек залічана сёлета ў аспірантуру Белдзяржуніверсітэта . Урачыстае пасяджэнне з гэтай нагоды прайшло 31 кастрычніка ў актавай зале Ліцэя БДУ.***

Маладых навукоўцаў павіншаваў рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў і прадстаўнік Міністэрства адукацыі Беларусі Наталля Шавво. Пачынаючы з 2006 года, сістэма падрыхтоўкі аспірантаў у нашай краіне крыху змянілася. Цяпер у яе аснове ляжыць мэтавая кантрактная форма навучання, паводле якой навуковая дзейнасць аспіранта і яго кіраўніка павінна стаць больш эфектыўнай і плённай. Высокія патрабаванні прад'яўляюцца да якасці і колькасці выкананай навуковай працы. У кантракце прадугледжаны асаблівыя патрабаванні да аспіранта і навуковага кіраўніка, а таксама абявязковая абарона дысертацыі пасля заканчэння тэрміну навучання ў аспірантуры і размеркаванне на 3 гады (як для дзённага, так і для завочнага аддзялення). Акрамя таго, у мэтах эфектыўнага адбору кандыдатаў для навучання ў аспірантуры перавага аддаецца выпускнікам ВНУ з ліку магістрантаў. Такім чынам, менавіта магістратура робіцца сувязным звяном паміж акадэмічнай універсітэцкай і пасляуніверсітэцкай адукацыямі. Згодна з новымі ўмовамі навучацца ў аспірантуры можна цяпер і за ўласныя сродкі.

Нагадаем, што тэрмін навучання ў аспірантуры складае 3 гады. Для паступлення неабходна здаць 3 экзамены: па замежнай мове, філасофіі і спецыяльнасці. У аспірантуры БДУ адкрыта 112 спецыяльнасцяў.

**Алена ГАЛКОЎСКАЯ**

МАЙСТРОЎНЯ

## ГУЛЬНІ ДЫПЛАМАТАЎ

***Студэнты 16-ці ВНУ з усіх рэгіёнаў нашай краіны бралі ўдзел у практыкуме "Мінская мадэль ААН–2007", які быў зладжаны 24–25 кастрычніка на базе САК "Брыганціна".***

Мадэляванне ААН – ролевая гульня, дзе ўвасабляецца работа ўстаноў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, абмяркоўваюцца самыя вострыя міжнародныя праблемы на прыкладзе канкрэтных сітуацый і выпрацоўваюцца падыходы да іх рашэння. Падчас мадэлявання ўдзельнікі прымаюць на сябе ролю прадстаўнікоў той ці іншай дзяржавы, становяцца дыпламатамі, ужываюцца ў праблемную сітуацыю, вучацца весці перамовы і знаходзіць аптымальныя рашэнні ў рамках выпрацаванай міжнароднай працэдуры.

Арганізатарамі практыкуму выступілі Беларускі дзяржаўны універсітэт, Беларуская асацыяцыя садзейнічання ААН, Міжнароднае грамадскае аб'яднанне "Развіццё" пры падтрымцы Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў, Еўрапейскай камісіі і Прадстаўніцтва ААН у Беларусі. Мерапрыемства прымеркавана да Міжнароднага дня ААН, які адзначаецца 24 кастрычніка. На адкрыцці "Мінскай мадэлі ААН–2007" былі кіраўніцтва БДУ, глава Прадстаўніцтва УВКБ ААН у нашай краіне Ілля Тадаровіч, прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Беларусі Ігар Красноў.

**Таццяна ЯНКОЎСКАЯ**

КАНФЕРЭНЦЫІ

## ШЛЯХІ МАДЭРНІЗАЦЫІ

**Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя "Рэформы і рэвалюцыі: працэсы мадэрнізацыі ў Беларусі і іншых краінах Еўропы", прымеркаваная да 90-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, прайшла 25–26 кастрычніка на гістарычным факультэце БДУ.**

У канферэнцыі ўдзельнічалі больш за 90 навукоўцаў і маладых даследчыкаў з Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы. Работа вялася ў 5-ці секцыях і падчас круглага стала, дзе абмяркоўваліся даклады, прысвечаныя працэсам мадэрнізацыі (якаснага змянення ўсіх бакоў грамадскага жыцця) як у нашай краіне, так і за яе межамі; сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным, этнакультурным аспектам індустрыяльнага грамадства; рэформам і рэвалюцыям у айчыннай і сусветнай гісторыі. З дакладам аб сучаснай эканамічнай мадэлі беларускай дзяржавы выступіў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь доктар палітычных навук Сяргей Касцян.

Падобная канферэнцыя ладзілася ўпершыню, але яе правядзенне плануецца зрабіць традыцыйным. Як лічаць арганізатары, вывучэнне працэсаў мадэрнізацыі на сучасным этапе патрабуе выяўлення новых тэарэтычных падыходаў і далейшага развіцця міждысцыплінарнасці ў гістарычнай навуцы. Асаблівая ўвага надаецца ўдзелу маладых даследчыкаў нароўні з вядомымі навукоўцамі.

## БІБЛІЯТЭКІ ЗАБЯСПЕЧАЦЬ ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ

**23–25 кастрычніка на базе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і юрыдычнага факультэта БДУ прайшла VIII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Мэнэджмэнт універсітэцкіх бібліятэк".**

Арганізатарам форумаў такога кшталту выступае Фунтаментальная бібліятэка БДУ, якая з'яўляецца рэспубліканскім каардынацыйным цэнтрам сеткі універсітэцкіх бібліятэк. Асноўная мэта – развіццё эфектыўнага супрацоўніцтва бібліятэк на рэгіянальным і міжнародным узроўнях; абмеркаванне сучасных праблем стварэння і выкарыстання карпаратыўных службаў і інфармацыйных рэсурсаў, актуальных аспектаў бібліятэчнага маркетынгу; каардынацыя і кааперацыя бібліятэк у адукацыйным працэсе і навуковых даследаваннях.

Тэма чарговай навукова-практычнай канферэнцыі – "Універсітэцкая бібліятэка ў сістэме забеспячэння якасці адукацыі". Сярод замежных гасцей былі прадстаўнікі Літвы, Латвіі, Расіі, Украіны, Германіі і Казахстана.

У адкрыцці канферэнцыі ўдзельнічалі намеснікі міністраў культуры і інфармацыі Беларусі Валерый Гедройц і Ігар Лапцёнак, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ Станіслаў Князеў, старшыня Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі Наталля Чуева, дырэктар Інстытута імя Гётэ ў Мінску, першы сакратар Пасольства ФРГ Катрын Оствальд-Рыхтэр, прадстаўнікі некаторых дыпламатычных місій.

У рамках канферэнцыі працавалі выставы выдавецтваў і кнігавыдавецкіх фірмаў, а таксама адбыліся прэзентацыі навуковых электронных інфармацыйных рэсурсаў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ЮБІЛЕІ

## "МЕХАНІЧНЫ" ЮБІЛЕЙ

***Кафедра тэарэтычнай і прыкладной механікі механіка-матэматычнага факультэта святкуе 70-годдзе з дня заснавання.***



*Выкладчыкі кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі ММФ*

Свой пачатак яна бярэ ў 1937 годзе, калі першым загадчыкам стаў прафесар Мікалай Сталяроў.

Пасля вайны кафедра аднавіла сваю работу толькі ў 1962 годзе. На працягу 8-мі гадоў яе ўзначальваў Міна Чапінога, які прыклаў шмат намаганняў для адраджэння кафедры.

З 1970 г. па 1986 г. кіраваў ёю доктар фізіка-матэматычных навук, доктар тэхнічных навук, прафесар Іван Прусаў. Менавіта яму было даручана стварэнне і развіццё аддзялення механікі на механіка-матэматычным факультэце.

На працягу наступных 14-ці гадоў з 1986 г. па 1999 г. на чале кафедры стаяў кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Мікалай Казлоўскі. Адразу, у сувязі з увядзеннем новых спецыялізацый робататэхнікі і тэорыі кіравання, кафедра атрымала новую назву – тэарэтычнай механікі і робататэхнікі.

З 1999 года і па сёння кафедрай заведуе доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Міхаіл Жураўкоў.

У 2001 г. адбылося перайменаванне ў кафедру тэарэтычнай і прыкладной механікі, што выклікана патрэбай ў падрыхтоўцы спецыялістаў-механікаў і пашырэннем напрамкаў навуковых даследаванняў супрацоўнікаў кафедры.

З 1 чэрвеня 2002 года пры кафедры створана і актыўна працуе НДЛ прыкладной механікі (загадчык – кандыдат фізіка-матэматычных навук Анатоль Кляўчэня). У лабараторыі выконваецца вялікая колькасць прыкладных НДР з прадпрыемствамі і арганізацыямі Беларусі і Расіі па розных напрамках механікі машын, геамеханікі, IT-тэхналогій.

У канцы 2000 года для найбольш эфектыўнага забеспячэння вучэбнага працэсу і выканання студэнтамі самастойнай навукова-даследчай работы была створаная вучэбная лабараторыя кампутарнай механікі.

Падчас навучання студэнты атрымліваюць грунтоўныя веды ў галіне матэматыкі, інфарматыкі і класічнай механікі, ім шырока выкладаюцца спецыяльныя дысцыпліны сучаснай механікі.

Кафедра тэарэтычнай і прыкладной механікі – адзіная ў нашай краіне, якая выпускае механікаў-тэарэтыкаў з глыбокай матэматычнай і кампутарнай падрыхтоўкай у адрозненне ад вузканакіраваных падобных спецыялізацый у тэхнічных ВНУ.

Асноўнымі напрамкамі навуковых даследаванняў сёння з'яўляюцца: механіка дэфармаванага цвёрдага цела, геамеханіка, гідрадынаміка, кампутарная механіка, колькасныя метады ў механіцы, нанамеханіка, мехатроніка, эргатычныя інфармацыйна-вымяральныя і кіраўнічыя сістэмы.

Штогод на кафедры выконваецца вялікая колькасць як фундаментальных, так і прыкладных даследаванняў у рамках дзяржаўных праграм і дамоў з прадпрыемствамі і арганізацыямі Беларусі, Расіі і іншых краін на суму ў некалькі сотняў тысяч долараў.

За ўвесь час на кафедры былі абароненыя больш за 20 доктарскіх і больш за 50 кандыдацкіх дысертацый. Усяго выйшла больш за 30 манаграфій, курсаў лекцый і вучэбных дапаможнікаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца супрацоўнікі кафедры, апублікавана больш за 900 артыкулаў у вядучых часопісах розных краін свету.

У рамках святкавання 70-годдзя кафедры з 29 кастрычніка па 2 лістапада ў БДУ адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Сучасны стан і актуальныя праблемы механікі ў Рэспубліцы Беларусь", якая закончылася ўрачыстым пасяджэннем у рэктарацe. Акрамя таго, з 15 па 17 лістапада падчас правядзення З'езду механікаў Беларусі супрацоўнікі кафедры выступяць з дакладамі па асноўных напрамках навуковых даследаванняў.

**Прафесар Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

КОНКУРСЫ

# СТУДЭНТЫ ГОДА–2007

***Экспертнай камісіяй на чале з прарэктарам Уладзімірам Суворавым падведзены вынікі штогадовага конкурсу "Студэнт года" па чатырох намінацыях.***

## АПТЫЧНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ



**"НАВУКА"**: Алена Тоўсцік, магістрант кафедры фізічнай оптыкі фізічнага факультэта, аўтар 11-ці публікацый, удзельніца 7-мі міжнародных і 3-х рэспубліканскіх канферэнцый, атрымальніца гранта Фонду фундаментальных даследаванняў:

– Фізікай захапляюся з дзяцінства. Любоў да дакладных навук традыцыйная для нашай сям'і – бабуля і дзядуля вучыліся ў БДУ на матэматыкаў. У Ліцэі БДУ я ўдзельнічала ў навуковых турнірах юных фізікаў – "фізбаях", было займальна. Пасля ва універсітэце напаткала цудоўнага кіраўніка, Уладзіміра Магільнага, які скіраваў мой інтарэс на оптыку. Оптыка – навука складаная і прыгожая. Стварэнне каляровых аб'ёмных выяў уражвае, радуе вока. Я вывучаю магчымасці і механізмы запісу фазавых галаграм у палімерных асяродках.

*– Хапае часу на ўдзел у грамадскім жыцці факультэта?*

– На малодшых курсах было цяжкавата сумяшчаць вучобу і навуковыя даследаванні, пасля стала крыху лягчэй. Мне прыемна дапамагаць абітурыентам. Таму заўсёды ўдзельнічала ў працы прыёмнай камісіі БДУ: спачатку ў грамадскай прыёмнай камісіі, а затым у тэхнічным сакратарыяце фізічнага факультэта, яшчэ дапамагала ў 2005–2006 гг. ладзіць цэнтралізаванае тэсціраванне ў БДУ.

*– Што пасля вучобы?*

– Хацела б застацца выкладчыкам на кафедры. Мяне зацікавіла методыка выкладання, паралельна з даследаваннямі па оптыцы я вывучала пытанні ўдасканалення адукацыйных сістэм, удзельнічала ў пяці канферэнцыях па гэтым напрамку. Сваю будучыню звязваю з БДУ, мне падабаецца выкладаць, перадаваць свае веды далей.

## ПАТРЭБНЫ ПРАДЗЮСАР



**"КУЛЬТУРА"**: Анастасія Ганчарэнка, студэнтка III курса ММФ, пераможца першага этапу конкурсу "Перліна Сталіцы", лаўрэат фестывалю эстрады БДУ:

– Спяваць пачала яшчэ зусім малечай. У сям'і я гэткая белая варона: дзед – акадэмік, тата – доктар навук, бабуля выкладала ў БДУ. Калі я скончыла музычную школу, тата настаяў, каб атрымала "сур'ёзную" адукацыю – так апынулася ў фізічным класе. Пасля школы два гады не спявала ўвогуле, а потым зразумела: сцэна – гэта жыццё і пачала старанна займацца вакалам. Ёсць адчуванне, што чым болей ты ўкладваеш, тым болей да цябе вяртаецца – асабліва, калі выходзіш на сцэну і атрымліваецца "дастукацца" да слухачоў, абудзіць іх эмоцыі.

*– Навучыцца валодаць голасам, "кіраваць" аўдыторыяй... Якія яшчэ цяжкасці чакаюць маладога спевака на шляху да поспеху?*

– Галоўная цяжкасць – вялікая колькасць жадаючых прабіцца. У многіх ёсць і сродкі, і сувязі... Мне ж вельмі дапамагае ўпраўленне па справах культуры БДУ, якое дае магчымасць выступаць, запрашае на конкурсы.

*– Што трэба для выхаду на вышэйшы ўзровень?*

– Найперш прадзюсар – чалавек, які б мяне "раскруціў". А яшчэ настаўнік, у якога я магла б адтачыць сваё майстэрства. Зараз са мной дзеліцца вопытам леташняя пераможца гэтай намінацыі співачка Вера Маркава, якая дапамагае парадамі і ўласным прыкладам. Але для далейшага росту патрэбны хтосьці, хто дасягнуў больш значных вяршынь. Напрыклад, мяне ўражваюць здольнасці Наталлі Падольскай.

*– Якія пестуеш мары і спадзяванні?*

– Найбліжэйшая мэта, можа, і сціплая, але вельмі для мяне істотная – атрымаць на выпускным зорку факультэта. А яшчэ планую выпрабаваць сябе падчас двух конкурсаў, што пройдуць у Палацы моладзі: трохдзённая "Калядная зорка" дасць магчымасць паспяваць з аркестрам, а "Новыя імёны" вабяць тым, што тут ацэньваюцца не толькі вакальныя, але і артыстычныя здольнасці.

## А НАВОШТА АДПАЧЫНАК?

**"СПОРТ"**: Андрэй Рудзь, студэнт V курса гістарычнага факультэта, член нацыянальнай зборнай па лёгкай атлетыцы. Сёлета стаў пераможцам Кубку Мінска ў бегу на дыстанцыі 1500 м, чэмпіёнам горада на дыстанцыі 3000 м, пераможцам Рэспубліканскага мемарыяла імя Юліна на дыстанцыі 1500 м, заваяваў 4-е месца на Кубку Беларусі і 5-е месца на Міжнародным мемарыяле імя Аглетдзінавай. Ён жа лаўрэат конкурсу "Супермэн БДУ–2006":

*– Як удаецца сумяшчаць вучобу і спорт?*

– Гэта досыць цяжка, максімальных вынікаў нельга дасягнуць у дзвюх сферах адначасова. Заўсёды даводзіцца чымсьці ахвяраваць. Пасля трэніроўкі на вучобу застаецца не так многа часу. А ёсць яшчэ і іншыя справы. Таму вельмі важны распарадак дня, каб выкарыстоўваць кожную вольную хвіліну. Напрыклад, едзеш у транспарце і чытаеш.

*– Калі ж адпачываеш?*

– Насамрэч я не лічу спорт цяжкай працай, пасля якой трэба набірацца сіл. Трэніроўкі для мяне зараз – сэнс жыцця, без іх я сябе не ўяўляю. Некалькі летніх тыдняў паміж сезонамі – вельмі няпростыя ў псіхалагічным плане. Каб развеяцца – выходжу куды-небудзь з сябрамі. Канешне, не магу дазволіць сабе часта хадзіць на начныя дыскатэкі, хаця і карціць.

*– Ты і спартсмен, і "супермен". Маеш, пэўна, многа фанатак сярод аднакурсніц?*

– Ну, не хацелася б быць нясціплым...*(смяецца)* Так, сапраўды многа. Праўда, яшчэ не намаляваўся дакладны вобраз, ідэальны для мяне – я вельмі пераборлівы. Але ў той жа час чалавек я адкрыты, камунікабельны. Увага з боку дзяўчат дадае станоўчых эмоцый, якія мне заўсёды патрэбныя.

*– Кіраўніцтва факультэта ідзе насустрач тваёму захапленню спортам?*

– Так, мне дазволілі вольнае наведванне, але, зразумела, многія выкладчыкі на гэта не зважаюць. Здараецца, што я не прыходжу на пэўныя семінары, а на заліку пачынаюцца праблемы – не хадзіў, не працаваў, мусіш "адрабіць". Але да пятага курса дайшоў, і пакуль толькі адзін раз мяне не дапусцілі да іспыту.



*– Якія мэты ставіш перад сабой зараз?*

– Хачоў бы заставацца ў спорце як мага даўжэй, але па-за ім у жыцці ёсць шмат займальнага. Тым больш, сур'ёзны спорт, акрамя фізічных затрат, патрабуе значных фінансавых выдаткаў, бо для падтрымкі аптымальных кандыцый неабходна сучасная фармацэя, якая каштуе надта дорага. Цяжка дасягнуць моманту, калі ўкладанні абернуцца пэўнай аддачай. З планаў самы, мабыць, амбіцыйны – патрапіць на Алімпійскія гульні. Па трэнерскіх падліках гэта можа быць у 2012 годзе ў Англіі. Спадзяюся, мой прагрэс у спорце працягнецца і гэтая мара ажыццявіцца.

## МЯККАСЦЬ ЛІДАРАМ ДА ТВАРУ

**"ЛІДАР"**: Дзмітрый Лебедзь, студэнт V курса гістарычнага факультэта, з'яўляецца начальнікам Штаба працоўных спраў БРСМ БДУ:

– Не ўпершыню атрымліваю падзяку з рук рэктара – заява нясціплая, але праўдзівая: адзначаны за ўдзел у "Працоўным леце–2005", "За актыўны ўдзел у грамадскім жыцці БДУ", "За асабісты ўнёсак у рэалізацыю праграмы «Працоўнае лета–2006» у БДУ". Але абранне Студэнтам года – значнае дасягненне. Гэтая пашана – за працаўладкаванне студэнцкай моладзі, чым я напружана займаўся апошнія два гады. Мы даем магчымасць студэнтам правесці вольны час з карысцю для сябе і для іншых, зарабіць крыху грошай.

*– Як студэнты далучаюцца да грамадскага жыцця БДУ?*

– Калі юнак прыходзіць да нас у пошуках працы, ён ужо праяўляе сваю актыўнасць, сваё жаданне рэалізавацца. Чалавек папрацаваў у будатрадзе адзін год, другі – на трэці я ўжо ведаю, чаго ён варты і што ён можа. Такіх людзей імкнуся падтрымліваць не толькі падчас працы, але і ў далейшым. Будатрады – гэта своеасаблівая школа, дзе чалавек выпрабоўваецца. Я, напрыклад, дагэтуль кантактую з людзьмі, з якімі лёс звёў на рэканструкцыі Аўгустоўскага канала.



*– Якія якасці самыя істотныя для лідара?*

– Шматкроць паўдзельнічаўшы ў праграмах падрыхтоўкі маладых лідараў, магу сказаць: кіраўнікі бываюць розныя. Я чалавек даволі мяккі, жорсткасць – не мой стыль. Імкнуся знайсці кампраміс, калі погляды з суразмоўцам не супадаюць. Магу пайсці на пэўныя ўступкі – галоўнае знайсці рэчышча, у якім можна працаваць разам і дамагацца адных мэтаў.

**Гутарыла Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# ТАК ТРЫМАЦЬ!

***Урачыстае гарадское закрыццё "Працоўнага семестра–2007" адбылося 16 кастрычніка ў БДУІРы.***

Моладзь, якая замест летняга адпачынку праводзіла свой час на будоўлях і прадпрыемствах Мінска, атрымала заслужаныя ўзнагароды. Лепшыя атрады, камандзіры, камісары (намеснікі камандзіраў) і байцы былі адзначаны іменнымі падзякамі і кубкамі.

Прадстаўнікі Белдзяржуніверсітэта, як заўсёды "наперадзе ўсёй планеты", сталі лаўрэатамі ў 8-мі намінацыях. Атрад "Вымпел", што працаваў на стадыёне спартыўнага комплексу БДУ, заваяваў званне "Найлепшы студэнцкі будаўнічы атрад", студэнт IV курса гістарычнага факультэта Аляксей Андрукоў – "Найлепшы камандзір будаўнічага атрада", Яўген Бароўка – "Найлепшы камісар будаўнічага атрада". Абсалютную перамогу таксама атрымалі нашы дзяўчаты з сельскагаспадарчага атрада "Шчомысліцы": Дар'я Прышчэпава (найлепшы камандзір), Алена Голуб (найлепшы камісар), Марыя Прахарэнка (найлепшы баец). Гэты ж калектыў заняў II месца па рэспубліцы, атрымаўшы падзяку ЦК БРСМ.

Натуральна, што такая колькасць узнагарод вылілася яшчэ ў адну перамогу. У выніку Штаб працоўных спраў БДУ, які ўзначальвае Дзмітрый Лебедзь, быў прызнаны найлепшым сярод астатніх ВНУ сталіцы. "Такія дасягненні – упершыню. Яны сталі вынікам нашых агульных намаганняў. Павялічылася колькасць студэнтаў, якія жадаюць працаваць, колькасць атрадаў, з'явіліся новыя напрамкі і формы працы. Гэта не засталося па-за ўвагай, што вельмі прыемна", – зазначыў галоўны камандзір.

Так трымаць, студэнцтва! Далейшых поспехаў!

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА**




**БелТА** – ролевая гульня "Мінская мадэль ААН–2007"; чвэрцьфінал сусветнага каманднага першынства па праграмаванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна (20.10, 27.10); міжнародная канферэнцыя , прысвечаная 90-годдзю Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі (23.10); рэарганізацыя факультэта журналістыкі БДУ ў інстытут (30.10); прыборы для дыягностыкі функцый дыхання УП "Унітэхпрам" БДУ; выступленне дэкана біялагічнага факультэта БДУ Уладзіміра Лысака на секцыі па біялогіі Першага з'езда вучоных Беларусі (01.11).

**БелаПАН** – чвэрцьфінал сусветнага каманднага першынства па праграмаванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна (23.10, 24.10, 26.10); "Мінская мадэль ААН–2007" (24.10); міжнародная канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі (25.10).

**"Звязда"** – выязны адукацыйны семінар для стараст першага курса БДУ ў "Брыганціне"; сустрэча рэктара БДУ з маці-студэнткамі і аспіранткамі (19.10); рэарганізацыя факультэта журналістыкі БДУ ў інстытут (31.10).

**"Народная газета"** – чвэрцьфінал сусветнага каманднага першынства па праграмаванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна (23.10, 26.10); інтэрв'ю з рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым (31.10); пра маці-аспірантку БДУ Ірыну Радзько (01.11).

**"Рэспубліка"** – чвэрцьфінал сусветнага каманднага першынства па праграмаванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна (23.10, 27.10); рэктар БДУ Васіль Стражаў пра ўдзел моладзі ў навуцы (25.10); распрацоўкі вучоных НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ (30.10).

**"7 дней"** – даследаванні "азонавых дзірак" Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ (18.10).

**"Настаўніцкая газета"** – аб падрыхтоўцы да міжнародных алімпіяд па біялогіі сярод школьнікаў, гутарка з загадчыкам кафедры генетыкі біялагічнага факультэта БДУ Наталляй Максімавай (20.10); круглы стол напярэдадні Першага з'езда вучоных Беларусі з удзелам дырэктара ННДЦ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі БДУ Юрыем Харыным; распрацоўкі вучоных НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ; гутарка з дырэктарам НДІ ядзерных праблем БДУ Уладзімірам Барышэўскім; размова з рэктарам РІВШ БДУ Міхаілам Дзямчуком (27.10).

**"Знамя юности"** – ролевая гульня "Мінская мадэль ААН–2007" (26.10).

**"Вечерний Минск"** – кулінарны конкурс Студгарадка; міжнародная канферэнцыя "Сеткавыя кампутарныя тэхналогіі" (18.10).

**"Минск-Новости"** – чвэрцьфінал сусветнага каманднага першынства па праграмаванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна (23.10, 30.10); залічэнне ў аспірантуру БДУ (30.10).

**"Минский курьер"** – чвэрцьфінал сусветнага каманднага першынства па праграмаванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна (23.10, 24.10, 30.10).

**tut.by** – чвэрцьфінал сусветнага каманднага першынства па праграмаванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна (23.10, 24.10, 25.10); стварэнне на базе факультэта журналістыкі БДУ Інстытута журналістыкі (31.10).

**naviny.by** – чвэрцьфінал сусветнага каманднага першынства па праграмаванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна (24.10).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ ураўненняў матэматычнай фізікі;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ ураўненняў матэматычнай фізікі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: рускай літаратуры, граматычнай права, крыміналістыкі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, інтэлектуальных сістэм;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай матэматыкі і інфарматыкі, тэорыі функцый, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, міжнародных эканамічных адносін, літаратурна-мастацкай крытыкі, раманскіх моў;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, германскіх моў, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду;

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ дыферэнцыяльных ураўненняў.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ сацыяльнай работы.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня публікавання аб'явы.**

**Адрас: г. Мінск, вул. Батанічная, 15, аддзел кадраў ДзІКСТа, тэл. 210-01-10.**

**ДУА "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРАЎ: інфармацыйных тэхналогій у адукацыі, філасофіі і метадалогіі універсітэцкай адукацыі;

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ аховы працы і заканадаўства аб працы (0,5).

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, каб. 215; тэл. 200-91-07.**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ПОДЫХ КІТАЯ Ў МІНСКУ

***Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ зладзіў 17 кастрычніка ў Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы выставу "Кітай – погляд знутры: Другі вецер".***



Свае фотаздымкі і кнігу эсэ, прысвечаныя Кітаю, прадставіў журналіст, фотамастак і галоўны рэдактар часопіса "Маналог" Аляксей Андрэеў.

*Жан Цю спытаў Канфуцыя:*

*– Хіба магыма даведацца, што было раней за неба і зямлю?*

*– Магчыма, – адказаў Канфуцый. – У старажытнасці было тое самае, што і зараз.*

Такімі радкамі пачынаецца кніга "Другі вецер", якая выдадзена пры падтрымцы Інстытута Канфуцыя. Неверагодна як у іх здолела змясціцца жыццё ўсяго наваколля з часу яго стварэння! Такія фундаментальныя думкі ўласцівы непараўнальнай кітайскай філасофіі, пачаткі якой згубіліся ў глыбіні тысячагоддзяў.

Побач з цудоўнымі ўрыўкамі з іншых твораў Аляксей Андрэеў прывёў апісанні сваіх падарожжаў па Кітаі, у якім ён пражыў тры гады. Яны выклікалі цікавасць не толькі ў беларускага чытача, але і ў саміх кітайцаў. Аўтар наведаў і буйныя гарады, і патрыярхальныя вёскі. Самі жыхары Паднябеснай вандруюць няшмат, таму з вуснаў нашага суайчынніка яны даведаліся багата новага пра сваю краіну.

Новым адкрыццём Кітая сталі і фотаздымкі, зробленыя Аляксеем Андрэевым, якія ўпершыню дэманстраваліся ў Беларусі. Імпрэзе адпавядаў цудоўны антураж. Чырвоныя кітайскія ліхтарыкі, што гарманіравалі з беларускімі колерамі, народная музыка, пачыва з гарбатай, прыязныя ўсмешкі людзей – усё рабіла месца сустрэчы вельмі ўтульным.

Да мерапрыемства непасрэднае дачыненне меў інстытут імя Канфуцыя БДУ, якому ў снежні споўніцца адзін год. Па словах намесніка дырэктара гэтай установы прафесара Ігара Малевіча, за такі кароткі прамежак часу ўдалося зрабіць шмат крокаў да збліжэння культур Беларусі і Кітая. Былі падрыхтаваны да выдання "Философия бодрости и здоровья", "Китайские календари", таксама наладжана сістэма выкладання кітайскай мовы. Кожны, хто пажадае далучыцца да найвялікшай спадчыны, можа запісацца на 3-месячны моўны курс, які каштуе даволі танна. Грунтоўнае ж вывучэнне кітайскай мовы адкрывае цудоўныя перспектывы, бо сёння ні водная краіна свету не абыходзіцца без Кітая. Трэба сказаць, што кітайцы наўмысна не займаюцца цывілізатарскай экспансіяй, для іх Кітай – гэта і ёсць увесь свет. Таму нават за межамі сваёй радзімы яны не прыстасоўваюцца да навакольнага жыцця, а ўладкоўваюць яго для сябе. І, згадзіцеся, справа тут не ў экспансіі, а ва ўсёпаглынальнай моцы старажытнай, але несастарэлай культуры.

P.S. У канцы лістапада фотавыстава "Кітай – погляд знутры" будзе дэманстравацца ў холе рэктарата БДУ. У яе адкрыцці прымуць удзел прадстаўнікі пасольства КНР у Мінску, а таксама Міністэрства замежных спраў Беларусі.

**Лейла ІСМАІЛАВА**

## СПАБОРНІЦТВЫ

# НА СУСВЕТНЫМ УЗРОЎНІ

**У Белдзяржуніверсітэце 24-26 кастрычніка прайшоў чвэрцьфінал сусветнага спаборніцтва па праграмаванні сярод студэнтаў па правілах ACM (Associatian for Computing Machinery).**

У выніку дзве каманды БДУ заваявалі права на паўфінал сусветных спаборніцтваў, які пройдзе ў лістападзе ў Санкт-Пецярбургу.

У мінскім турніры за 11 пуцёвак на паўфінал змагаліся 47 каманд з 20-ці універсітэтаў Беларусі, Калінінградскай вобласці Расіі, Літвы, Латвіі і Эстоніі. Акрамя студэнтаў БДУ, у Санкт-Пецярбург паедуць па дзве каманды ад БДУІРа, Універсітэта імя Эмануіла Канта (г. Калінінград, Расія) і Вільнюскага універсітэта (Літва), а таксама па адной камандзе з Латвійскага (г. Рыга), Каўнаскага тэхнічнага (Літва) і Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

Згодна з умовамі ў склад кожнай каманды ўваходзіла 3 удзельнікі. У асноўным туры яны павінны былі рашыць 9 задач па праектаванні алгарытмаў і праграм на мовах высокага ўзроўню. Упершыню спаборніцтвы праходзілі ў адной прасторнай зале, дзе размясціліся ўсе ўдзельнікі і кампутарнае абсталяванне. Пратакол спаборніцтваў, які адлюстроўваў праверку рашэнняў, трансляваўся на праекцыйнай панэлі ў холе галоўнага корпуса БДУ, а таксама на экранах на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, механіка-матэматычным факультэце.

У арганізацыі спаборніцтваў значную падтрымку аказалі вядучыя IT-кампаніі – удзельнікі навукова-тэхналагічнай асацыяцыі "Інфапарк" (IBA, Epam Systems, СофтКлуб, I-Transition, "Сістэмныя тэхналогіі", "Эфектыўныя праграмы", БелХард), якія усталявалі 55 новых кампутараў і зладзілі майстар-класы. Акрамя таго, выпускнікі-праграмісты маглі пазнаёміцца з прыдатнымі для іх вакансіямі.

**Яўген ПЕШЧУР**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА




# 55 ГОД ПА ПРАВУ ПЕРШЫ!

Прыстанак гісторыкаў, дом, які стаў родным для многіх тысяч студэнтаў БДУ, – інтэрнат № 1 святкаваў першага лістапада сваё 55-годдзе. Сімвалічна, што менавіта ў гэты дзень у рамках гарадскога семінара "Арганізацыя выхаваўчай работы ў інтэрнаце навучальнай установы сталіцы" наш калектыў атрымаў дыплом за перамогу ў агглядзе-конкурсе "Найлепшы інтэрнат навучальнай установы сталіцы" і падарунак ад Мінгарвыканкама – тэлевізар. Цяпер тут будзе абсталявана сапраўдная відэазала, паколькі універсітэт прэзентаваў DVD-прайгравальнік і акустычную сістэму хатняга кінатэатра. Усім студэнтам ад Апякунскага савета Студгарадка дастаўся яшчэ і вялікі торт. Прарэктар БДУ па вучэбна-выхаваўчай рабоце Уладзімір Суворaў ухваліў працу работнікаў інтэрната. Дырэктар Студгарадка Міхаіл Чарапеннікаў таксама адрасаваў ім цёплыя словы.

На ўрачысты вечар завіталі і дэкан гістарычнага факультэта Сяргей Ходзін. Ён узгадаў свае студэнцкія гады, праведзеныя ў гэтым інтэрнаце, і павіншаваў усіх са святам.

Феерверк падарункаў быў прапанаваны падчас канцэртнай праграмы. Гасцей сустрэлі музы, якія паказалі творчыя нумары ад кожнага інтэрната: песні-прысвячэнні, гарачыя танцы, кветкі, пачастункі і нават вялікую паштоўку, зхмайстраваную рукамі жыхароў інтэрната № 2. А затым усіх прысутных запрасілі ў своеасаблівае тэатралізаванае падарожжа па эпохах і краінах. Госці змаглі апынуцца ў Старажытнай Грэцыі, стаўшы сведкамі нараджэння Афрадыты, сустрэцца з егіпецкай багіняй і кітайскім філасофам, паўдзельнічаць у сярэднявечным рытуале пасвячэння ў рыцары, у Новым часе – пазнаёміцца з калекцыяй манет, наведаць літаратурны салон і патрапіць на прыдворны баль. А Найноўшы час студэнты назвалі Эпохай № 1 – эпохай інтэрната, першага па праву!

**Іна ХАЗЕЕВА**

## ШКОЛА АКТЫВУ

# ТЫ STARACTA!

**Са сваімі праблемамі студэнты звяртаюцца ў першую чаргу да старастаў груп, якія мусяць дапамагаць. Таму апошнія павінны быць людзьмі аўтарытэтнымі і дасведчанымі. Усё гэта прыходзіць з вопытам. Але дзе яго ўзяць, калі яшчэ ўчора ты вучыўся ў школе, гімназіі ці ліцэі, а сёння ты ўжо лідар і адказваеш за стан калектыву?**

Для палягчэння "ўжывання" ў гэтую ролю 16–17 кастрычніка для 250-ці старастаў I курса на базе САК "Брыганціна" быў арганізаваны выязны адукацыйны семінар "Ты STARаста!". Мерапрыемства аказалася вельмі карысным. Два дні моладзь ўспрымала інтэнсіўную інфармацыю пра функцыянаванне універсітэта і разглядала розныя прафесійныя сітуацыі.

На пачатку семінара адбылася лекцыя рэктара БДУ Васіля Стражава і прэс-канферэнцыя з удзелам прарэктара Уладзіміра Суворава і іншых прадстаўнікоў кіраўніцтва. Студэнты былі дужа актыўнымі і задавалі безліч пытанняў. Яны, канешне, не засталіся без адказаў. Больш за ўсё старастаў непакоіў лёс новага корпуса на Кальварыйскай. Большасць эмоцый выклікала прапанова аб пераводзе аддзялення "Сацыялогія" гуманітарнага факультэта на ФФСН. Як заўсёды ўсіх цікавіла засяленне ў інтэрнаты, дзейнасць студэнцкіх арганізацый БДУ, прымяненне пластыкавых білетаў, арганізацыя харчавання ў вучэбных карпусах і інш.

У другой палове дня студэнты ўдзельнічалі ў трэнінгу "Урокі псіхалагічнага мэнэджменту для старастаў", арганізаваным Псіхалагічнай службай БДУ. Галоўнай задачай было вызначэнне функцый старасты. Студэнты творча падышлі да ўсіх заданняў і выдатна іх адолелі.

Затым удзельнікаў семінара чакала работа ў некалькіх секцыях.

*"Пазавучэбная дзейнасць: дадзенік па структурных падраздзяленнях універсітэта"*. На ёй прадстаўнікі УВРМ, Студгарадка і спартыўнага клуба распавялі пра ўсе магчымасці карыснага і актыўнага баўлення вольнага часу.

*"Курс маладога старасты: трэнінг арганізатарскіх здольнасцяў"*. Сапраўдную вытрымку павінны былі прадэманстраваць старасты, апанентамі якіх сталі старшыя таварышы, што выступілі ў ролі прадстаўнікоў адміністрацыі універсітэта. Нягледзячы на наўмысную "нелаяльнасць", старасты павінны былі граматна адстаяць сваю пазіцыю і дабіцца станоўчага вырашэння свайго пытання.

*"Арганізацыя навучальнага працэсу"*. Начальнік Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Людміла Хухлындзіна падрабязна асвятліла правы і абавязкі студэнтаў, парадак налічэння стыпендыі, перавод з платнай формы навучання на бюджэтную, магчымасць скідак для студэнтаў-платнікаў, прычыны адлічэння і інш.

*"Сістэма студэнцкага самакіравання БДУ"* – ролевая гульня з прымяненнем ноу-хау, арганізаваная Студсаюзам. Падчас яе студэнты здолелі разабрацца ў дзейнасці ўсіх маладзевых арганізацый універсітэта.

Пасля насычаных заняткаў увечары дзеля "разгрузкі" была зладжана дыскатэка.

На другі дзень працягнулася работа ў секцыях, пасля чаго былі падведзены вынікі. Усе ўдзельнікі атрымалі сертыфікаты аб адпаведным навучанні. На заканчэнне была праведзена спартландыя.

Стомленыя, але задаволеныя юнакі везлі ў Мінск мноства пазітыўных эмоцый і ўсведамленне сваёй далейшай працы ў якасці старастаў на факультэтах.

**Тацццяна РАДЗЮК**

## З УСМЕШКАЙ

На іспыце па грамадзянскім праве:

– Як вы глядзіце на правы?

– Гэтак жа, як і налева...

***

Нататка экзаменатару: "Будзьце тактоўнымі. Не паўтарайце пытанне, калі студэнт яго не пачуў, а непрыкметна перавядзіце размову на іншую тэму".

***

– Куды прымаюць без іспыту?

– У Інстытут Скліфасоўскага.

Лекцыя па матэматыцы, у аўдыторыі лектар і 3 студэнты. Неўзабаве ўстаюць 5 чалавек і сыходзяць. Лектар:

– Вось зараз прыйдуць яшчэ двое, і ўвогуле нікога не застанецца.

***

Прафесар забыў дома ключ. Стукае. Выходзіць жонка:

– Прафесара няма дома, ён на лекцыі.

– Добра, я зайду пазней.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

9 лістапада 2007 года
Падпісана да друку 08.11.2007 г.
Зак. 1140. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by